# ГЕНАЦЫД НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

для навучэнцаў VII – IX класаў

М.Р.Хіневіч, настаўнік
гісторыі і геаграфіі,
ДУА "Сеўрукоўская базавая
школа Баранавіцкага раёна"

**Мэта:** стварэнне ўмоў для грамадзянскага і патрыятычнага выхавання навучэнцаў, захавання гістарычнай памяці, фарміравання аб'ектыўнага ўяўлення аб Вялікай Айчыннай вайне праз выкарыстанне сучасных тэхналогій.

**Задачы**:

пашырыць веды вучняў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны;

развіваць цікавасць да гісторыі сваёй Радзімы, камунікатыўныя навыкі, здольнасць суперажываць;

садзейнічаць выхаванню ў навучэнцаў імкнення супрацьстаяць жорсткасці і насіллю ў сучасным свеце.

Форма правядзення: інтэлектуальна-пазнавальны марафон

Удзельнікі: навучэнцы VII – IX класаў

Абсталяванне: мультымедыйная ўстаноўка

Ход

**Уступнае слова настаўніка:**

- Як добра прачынацца раніцай і ведаць, што ў цябе наперадзе цудоўны дзень, што табе нічога не пагражае, што ўсе твае мары здзейсняцца. Як добра быць проста шчаслівым чалавекам!

Вашы аднагодкі ў 1941 годзе таксама хацелі жыць, вучыцца, радавацца кожнаму дню, бачыць мірнае неба над галавой. Але ім давялося перажыць цяжкія выпрабаванні вайны, ахвяраваць усім, нават жыццём, дзеля Перамогі.

Як вы мяркуеце, чаму сёння наша мерапрыемства прысвечана генацыду беларускага народа?

*Адказы вучняў*

Сёння мы даведаемся, чаму менавіта 9 снежня адзначаецца Міжнародны дзень ахвяр генацыду, яшчэ раз узгадаем жахлівыя старонкі нашай гісторыі.

*Прагляд фрагмента відэароліка "Генацыд беларускага народа. Спецпраект "Гістарычная памяць – спадчына будучага" (Дадатак Б)*

**Слайды 1, 2**

**Першы вучань.**

У верасні 2015 года Генеральная Асамблея Арганізацыі Аб'яднаных нацый пастанавіла абвясціць 9 снежня Міжнародным днём памяці ахвяр злачынства генацыду. Гэта дата была выбрана ў сувязі з тым, што 9 снежня 1948 года была прынята Канвенцыя аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго.

**Слайд 3**

**Другі вучань.** Генацыд – гэта дзеянні, якія здзяйсняюцца з намерам знішчыць, амаль або часткова, якую-небудзь нацыянальную, этнічную, расавую групу шляхам забойства, прычынення цяжкіх цялесных пашкоджанняў, стварэння нясцерпных жыццёвых умоў.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны на акупіраванай тэрыторыі Беларусі было знішчана 2,2 млн чалавек.

**Слайд 4**

**Першы вучань.**

Нямецка-фашысцкія канцэнтрацыйныя лагеры пачалі стварацца ў Германіі ў 1933 годзе пасля прыходу гітлераўцаў да ўлады.

Да пачатку фашысцкай агрэсіі вязнямі канцлагераў былі нямецкія антыфашысты, а таксама асобы, якія праследаваліся па расавых або рэлігійных матывах.

**Слайд 5**

**Другі вучань.**

У 1938 – 1939 гадах сістэма канцлагераў была распаўсюджана на акупіраваныя краіны. На працягу 1939 – 1945 гадоў былі створаны лагеры Асвенцым, Майданэк, Трэблінка, Сабібур і інш. Яны былі абсталяваны газавымі камерамі і крэматорыямі, якія дазвалялі праводзіць масавае знішчэнне людзей. З 18 мільёнаў чалавек, якія прайшлі праз канцлагеры, загінула 11 мільёнаў.

**Слайд 6**

**Першы вучань.**

Лагеры смерці ствараліся немцамі на часова акупіраванай тэрыторыі СССР для масавага знішчэння савецкіх грамадзян, падаўлення іх супраціўлення, выкарыстання для прымусовай працы. Людзі сталі ахвярамі акупацыйнага рэжыму, палітыкі генацыду.

**Слайд 7**

**Другі вучань.**

На тэрыторыі акупіраванай Беларусі было больш за 260 канцэнтрацыйных лагераў. Усе яны дзяліліся на лагеры смерці для ваеннапалонных (дулагі, шталагі, аўфлагі) і грамадзянскага насельніцтва (жаночыя, працоўныя, перасыльныя, штрафныя лагеры, гета).

**Слайд 8**

**Першы вучань.** Адзін з першых лагераў смерці на тэрыторыі Беларусі быў створаны па распараджэнні камандуючага 4-й палявой арміяй генерала-

фельдмаршала Клюге ў вёсцы Дразды каля Мінска, дзе ўтрымліваліся ваеннапалонныя і мірныя жыхары ва ўзросце ад 15 да 60 гадоў.

**Слайд 9**

**Другі вучань.** Канцэнтрацыйны лагер Трасцянец – трэці па колькасці загінуўшых пасля Асвенцыма і Майданэка.

**Першы вучань.** Трасцянец – найбуйнейшы лагер смерці на тэрыторыі Беларусі і акупіраваных раёнаў СССР, створаны ў наваколлях Мінска, дзе знішчаліся мірныя жыхары, ваеннапалонныя з Савецкага Саюза, а таксама грамадзяне Польшчы, Аўстрыі, Германіі, удзельнікі антыфашысцкай падпольнай барацьбы і партызанскага руху. Людзей расстрэльвалі каля загадзя выкапаных равоў. Трупы закопвалі і ўтрамбоўвалі гусенічнымі трактарамі.

**Слайд 10**

**Другі вучань.** У архівах і фондах мінскага Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваюцца копіі дакументаў расследавання злачынстваў акупантаў у Трасцянцы, у якіх прыведзены наступныя дадзеныя:

у 34 ямах-магілах урочышча Благаўшчына пахаваны 476 тысяч савецкіх грамадзян;

у печы ўрочышча Шашкоўка знішчана 68 тысяч чалавек, у хляве – яшчэ 2 тысячы;

па самых мінімальных падліках, у раёне лагера Трасцянец фашыстамі знішчаны 546 тысяч чалавек.

Канцэнтрацыйныя лагеры былі створаны ў Лупалава (Магілёўская вобласць), Дамачава, Бронная гара (Брэсцкая вобласць), Масюкоўшчына каля Мінска і нш.

**Слайды 11, 12, 13**

У Баранавіцкім раёне акупантамі таксама былі створаны канцлагеры – у вёсках Лясная і Калдычэва.

**Слайд 14**

**Першы вучань.** 20 ліпеня 1941 года на вуліцах горада Мінска быў расклееены загад нямецкага камандавання, на падставе якога ўсё яўрэйскае насельніцтва павінна знаходзіцца ў асобным раёне. Так было створана Мінскае гета. Яно было абнесена калючым дротам. Яўрэі мелі права выходзіць адтуль толькі на працу.

**Слайд 15**

**Другі вучань.** Каб яшчэ больш прынізіць яўрэйскае насельніцтва, немцы ўвялі знакі ганьбы і рабства.

Яўрэі ўсходніх абласцей павінны былі насіць на левым баку грудзей і спіне жоўтыя кругі – латы, а яўрэі заходніх абласцей – на рукавах белыя павязкі з вышытай жоўтай шасціканцовай зоркай. Пасля гэтыя павязкі немцы замянілі на жоўтую шасціканцовую зорку, нашытую на грудзях і спіне.

Загнаўшы яўрэйскае насельніцтва за дрот, немцы пачалі “наводзіць парадкі” ў гета. Яны знішчалі і расстрэльвалі яўрэяў па розных падставах,

групамі і ў адзіночку, забівалі працуючых і беспрацоўных, дзяцей і старых, жанчын і інвалідаў.

**Слайд 16**

**Першы вучань.** Раніцай 28 ліпеня 1941 года, калі калоны адправіліся на працу, у гета прыбылі гестапа і паліцыя. Яны выгналі на плошчу ўсё непрацоўнае насельніцтва. Людзей грузілі ў душагубкі і адвозілі ў Трасцянец. У гэтым пагроме загінулі дзясяткі тысяч людзей. У Мінскім гета па афіцыйных звестках былі знішчаны 100 тысяч чалавек.

**Слайд 17**

**Другі вучань.** У час аднаго з пагромаў 2 сакавіка 1942 года акупанты знішчылі 5000 мінскіх яўрэяў. Былі сярод іх і 200 сірот з дзіцячага дома – іх расстралялі разам з выхавальнікаміі і медыцынскім персаналам. Каля 500 трупаў звалілі ў яму, размешчаную на скрыжаванні сучасных вуліц Заслаўскай і Мельнікайтэ.

Сёння на гэтым месцы знаходзіцца мемарыяльны комплекс, які так і называецца: "Яма". Яго аўтары – старшыня Саюза яўрэйскіх аб'яднанняў і абшчын Беларусі, мастак і архітэктар Леанід Левін, скульптар з Ізраіля Эльза Полак.

**Слайд 18**

**Першы вучань.**

Падчас вайны амаль у кожным беларускім горадзе былі створаны гета. Баранавічы і Баранавіцкі раён не сталі выключэннем. Гета існавалі ў горадзе Баранавічы, вёсках Новая Мыш, Палонка, Моўчадзь, Гарадзішча, Сталовічы.

**Слайд 19**

**Другі вучань.** На акупіраванай тэрыторыі Беларусі было праведзена 140 карных аперацый, падчас якіх фашысты знішчылі каля 9200 населеных пунктаў. У Брэсцкай вобласці – 835, у Баранавіцкім раёне – 58. Разам з людзьмі было спалена 628 вёсак, у Баранавіцкім раёне – вёска Застарынне.

Мемарыяльны комплекс Хатынь стаў сімвалам трагедыі беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**Слайд 20**

**Першы вучань.** 5 студзеня 2022 года Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка падпісаў закон "Аб генацыдзе беларускага народа".

Законам прадугледжваецца юрыдычнае прызнанне генацыду беларускага народа, якое было здзейснена ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

А гэта значыць, што ўстанаўліваецца крымінальная адказнасць за публічнае адмаўленне генацыду беларускага народа. Напрыклад, праз размяшчэнне адпаведнай інфармацыі ў СМІ або ў інтэрнэце.

**Слайд 21**

А зараз я прапаную вам прыняць удзел у віктарыне "Генацыд на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны" (Дадатак А).

Самыя актыўныя ўдзельнікі, якія набяруць найбольш балаў, атрымаюць Сертыфікат на "10" па гісторыі Беларусі. Калі будзе набрана аднолькавая колькасць балаў, будзе ўлічвацца час выканання заданняў.

**Правядзенне віктарыны, падвядзенне яе вынікаў.**

**Другі вучань.** Да вашай увагі прапануем знаёмства з інтэрактыўнай картай і аўдыягідам “Ахвярам Халакоста Баранавіцкай зямлі прысвячаецца…”.

**Ссылка на інтэрактыўную карту (распрацоўшчык Вашкевіч Артур, вучань VIII класа)**

https://www.google.com/maps/d/edit?mid=1uib0HbBL1HGYdTPXUTiy8le4suj3pek&usp=sharing

**Ссылка на аўдыягід (распрацоўшчык Вашкевіч Артур, вучань VIII класа, агучыла Мазур Таццяна, вучаніца IX класа )**

https://izi.travel/browse/16ec1498-2e79-494a-a9ba-78ff72b62fe5/ru

**Заключнае слова настаўніка:**

Усё далей і далей адыходзяць ад нас суровыя гады вайны. Усё менш і менш застаецца ўдзельнікаў і сведкаў тых падзей. Перажытая трагедыя і дасягнутая Перамога – вечныя крыніцы болю і горычы, гонару і славы беларускага народа. Мы павінны памятаць і шанаваць нашу гісторыю, захоўваць гістарычную памяць, перадаваць яе з пакалення ў пакаленне, бо без ведання свайго мінулага не магчыма пабудаваць квітнеючую будучыню!

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Великая Отечественная война 1941 – 1945: Энциклопедия/Глав. ред. М.М. Козлов. – М.: Сов. энциклопедия, 1985. – 832 с.
2. Геноцид белорусского народа: информационно-аналитические материалы и документы /Генеральная прокуратура Республики Беларусь; под общей редакцией А.И. Шведа. - Мн.: «Беларусь». 2022г. – 175с.: ил.
3. Памяць. Баранавічы. Баранавіцкі раён: Гіст.-дакум. хроніка г. Баранавічы і Баранавіцкага р-на. – Мн.: БЕЛТА, 2000 г. — 736 с.: іл.
4. Трагедия белорусских деревень, 1941-1944: Документы и материалы /Сост. Н..В. Кириллова, В.Д. Селеменев и др.; Редкол. В.И. Адамушко и др. М.: Фонд «Историческая память», 2011. – 536 с.: илл.

Дадатак А

**Віктарына**
**“Генацыд на тэрыторыі Беларусі ў гады**
**Вялікай Айчыннай вайны”**

1. Генацыд – гэта…
2. Які дакумент і калі быў прыняты ў Рэспубліцы Беларусь аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны?
3. Якія дзеянні адносяць да генацыду?
4. Колькі людзей знішчана на акупіраванай тэрыторыі Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны?
5. Колькі лагераў смерці было створана на беларускіх землях?
6. Пералічыце буйныя канцлагеры на тэрыторыі нашай краіны?
7. Назавіце, якія канцлагеры існавалі на тэрыторыі Баранавіцкага раёна?
8. Дзе ў Баранавіцкім раёне былі створаны гета?
9. Дзе знаходзіцца памятны знак, змешчаны на фотаздымку? Каму ён прысвечаны?



10. Колькі ўсяго вёсак спалена на тэрыторыі нашай краіны?
11. Колькі вёсак спалена разам з людзьмі?
12. Дзе знаходзіцца наступны помнік?



13. Колькі на тэрыторыі Брэсцкай вобласці спалена вёсак?
14. Колькі вёсак спалена на тэрыторыі Баранавіцкага раёна ?
15. Якая вёска Баранавіцкага раёна спалена разам з людзьмі?
16. Колькі карных аперацый было праведзена на тэрыторыі Беларусі?
17. Што гэта за помнік і дзе ён знаходзіцца?




18. Чаму прысвечаны наступны помнік і дзе ён знаходзіцца?



19. Як называецца мемарыял і дзе ён знаходзіцца?



**Адказы:**

1. Генацыд – гэта дзеянні, накіраваныя на поўнае або частковае знішчэнне насельніцтва па расавай, рэлігійнай або нацыянальнай прыналежнасці.

2. Закон «Аб генацыдзе беларускага народа», студзень 2022 года.

3. Забойства людзей; прычыненне сур'ёзных цялесных пашкоджанняў; наўмыснае стварэнне для людзей такіх жыццёвых умоў, якія прадугледжваюць яе поўнае або частковае фізічнае знішчэнне.

4. 2,2 мільёны чалавек.

5. 260.

6. Трасцянец, Дразды, Лупалава (Магілёўская вобласць), Дамачава, Бронная гара (Брэсцкая вобласць), Масюкоўшчына каля Мінска.

7. Калдычэва, Лясная.

8. Горад Баранавічы, вёскі Новая Мыш, Палонка, Моўчадзь, Гарадзішча, Сталовічы

9. Горад Баранавічы, Баранавіцкае гета.



10. Больш за 9200 сельскіх населеных пунктаў.

11. 628 вёсак.

12. Мемарыяльны комплекс Хатынь, Мінская вобласць.



13. 835 вёсак.

14. 58 вёсак
15. Застарынне.
16. 140.
17. Калдычэва, «Сцяна плачу».




18. Баранавічы, "Скорбящая мать", прысвечаны расстраляным ваеннапалонным.



19. "Яма", на месцы пахавання мінскіх яўрэяў.



Дадатак Б

Відэаролік “Генацыд беларускага народа. Спецпраект “Гістарычная памяць – спадчына будучага” [Электронны рэсурс]. – 2022. – Рэжым доступу: https://www.youtube.com/watch?v=LSf4CV0oGzw. Дата доступу: 09.12.2022.